Зыгмантовіч Святлана



# Фарміраванне прафесійных кампетэнцый будучых бібліятэкараў

Доўгі час айчынная адукацыя зыходзіла з таго, што навучанне – гэта змяненне ведаў і ўяўленняў чалавека аб рэальным свеце, атрыманне новых ведаў аб працэсах і з'явах, выяўленне і засваенне новых сувязяў паміж імі. Навучэнцы былі скіраваны на засваенне факталагічнага матэрыялу, узнаўленне гатовых ведаў і прымяненне іх у знаёмых сітуацыях. Ва ўменні інтэграваць гэтыя веды і прымяняць іх для атрымання новых ведаў будучыя спецыялісты аказваліся не заўжды гатовымі. У апошнія дзесяцігоддзі адбываюцца значныя змены ў парадыгме навучання. Развіцце становіцца ключавой мэтай педагагічнага працэсу.

ВНУ прызвана рыхтаваць чалавека да актыўнай дзейнасці ў розных сферах жыцця грамадства. Патрэбны людзі, якія ўмеюць вучыцца самастойна, ставіць праблемы і распрацоўваць праекты па іх вырашэнню, умеюць працаваць у групе і супрацоўнічаць, думаць самастойна, генерыраваць новыя ідэі, г.зн. валодаюць крытычным і творчым мысленнем; умеюць арыентавацца на рынку працы, здольны адаптавацца да зменлівых жыццёвых сітуацый, аднаўляць профіль дзейнасці ў залежнасці ад змянення стратэгіі развіцця прадпрыемства, засвойваць, распрацоўваць і ўкараняць інавацыі і г.д. Рэалізацыя ўказаных патрабаванняў да прафесійнай падрыхтоўкі выпускнікоў ВНУ прадугледжвае дасягненне інтэграванага канчатковага выніку адукацыі – сфарміраванасці ў выпускніка ключавых кампетэнцый як адзінства ведаў, абагульненых уменняў, універсальных здольнасцей і гатоўнасці да вырашэння вялікіх груп задач – ад асабістых да сацыяльных і прафесійных.

Як адзначаецца ў матэрыялах ЮНЕСКА, адукацыя прызвана дапамагчы чалавеку:

– навучыцца пазнаваць, г.зн. забяспечыць яго неабходным інструментарыем для разумення ўсяго, што адбываецца ў свеце;

– навучыцца працаваць, каб ажыццяўляць у навакольным свеце патрэбныя змены;

– навучыцца сумеснаму жыццю, каб прымаць удзел ва ўсіх відах чалавечай дзейнасці і супрацоўнічаць з іншымі людзьмі;

– навучыцца, нарэшце, проста жыць (1).

У апошні час гэтыя ўстаноўкі знаходзяць сваю канкрэтызацыю ў распрацоўцы кампетэнтнаснага падыходу да навучання і выхавання выпускніка вышэйшай школы. Кампетэнтнасны падыход з'яўляецца альтэрнатыўным у адносінах да традыцыйнага падыходу і «знаниевой» адукацыйнай мадэлі і, у адрозненне ад апошняй, арыентаваны на фарміраванне ў выпускнікоў не толькі ведаў, уменняў і навыкаў выканання пэўнага віду работы, вырашэння тыповых задач, але і на фарміраванне каштоўнасцей, вопыту прымянення ведаў у новых сітуацыях, вырашэння задач высокай ступені нявызначанасці. Змястоўны аспект тэрміна «кампетэнцыя» ўключае тры складаючыя: «кагнітыўную» (веды), аперацыйную (спосабы дзейнасці і практычную гатоўнасць да вырашэння задач з высокай ступенню нявызначанасці), аксіялагічную (засваенне каштоўнасцей, каштоўнасныя адносіны да прафесійнай працы і асабістага росту) (3, с. 43).

Розныя аўтары прыводзяць свае аўтарскія мадэлі і тыпалагізацыю кампетэнцый па пэўным сферам, выдзяляюць ключавыя кампетэнцыі і ўваходзячыя ў іх кампаненты, крытэрыі кампетэнтнасцей і г.д. (2; 3; 4; 5).

Зыходзячы з сусветнага вопыту, да ключавых кампетэнцый аднесены:

– кампетэнцыі ў сферы пазнавальнай дзейнасці, што грунтуюцца на засваенні спосабаў самастойнага набыцця ведаў з розных крыніц інфармацыі;

– кампетэнцыі ў сферы грамадскай дзейнасці (выкананне роляў грамадзяніна, выбаршчыка, члена сацыяльнай групы, калектыву);

– кампетэнцыі ў сферы працоўнай дзейнасці (у тым ліку ўменне аналізаваць і выкарыстоўваць сітуацыю на рынку працы, ацэньваць і ўдасканальваць свае прафесійныя магчымасці, навыкі самаарганізацыі і г.д.);

– кампетэнцыі ў бытавой сферы (уключаючы аспекты сямейнага жыцця, захавання і ўмацавання здароўя і г.д.);

– кампетэнцыі ў сферы культурнай дзейнасці (уключаючы выбар шляхоў і спосабаў выкарыстання вольнага часу, якія культурна і духоўна ўзбагачаюць асобу) (4, с. 17).

Фарміраванне гэтых кампетэнцый павінна ажыццяўляцца комплексна і вырашаецца ў ВНУ ў ходзе ўсяго вучэбна-выхаваўчага працэсу, у якім нельга жорстка замацаваць канкрэтныя дысцыпліны альбо віды дзейнасці «адказнымі» за вырашэнне названых задач. Разам з тым, відавочна асобая роля ў дадзеных адносінах розных груп дысцыплін. Так, сацыяльна-гуманітарным і агульнанавуковым дысцыплінам (1-шы і 2-гі блокі вучэбнага плану) належыць прыярытэтная роля ў фарміраванні сацыяльных кампетэнцый, кампетэнцый пазнавальнай дзейнасці, у развіцці інтэлектульнай дапытлівасці, а таксама ў навучанні жыццю – праз агульнае развіццё, творчасць, мастацка-эстэтычную падрыхтоўку і інш.

Прэрагатывай пераважна спецыяльных дысцыплін з'яўляецца задача «дапамагчы навучыцца працаваць», фарміраваць кампетэнцыі ў сферы працоўнай дзейнасці. Пры падрыхтоўцы бібліятэчных кадраў у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў у вучэбным плане выдзяляецца цэлы шэраг агульнапрафесійных, спецыяльных дысцыплін і дысцыплін спецыялізацый. Так, сярод агульнапрафесій-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ных дысцыплін бібліятэчна-бібліяграфічнага зместу выдзяляюцца «Бібліяграфазнаўства. Тэорыя і гісторыя», «Гісторыя беларускай бібліяграфіі», «Бібліятэказнаўства. Тэорыя і гісторыя», «Сацыяльныя камунікацыі». Іх вывучэнне забяспечвае, перш за ўсё, фундаментальную падрыхтоўку ў асноўнай і сумежнай галінах, ствапрае рэзерв ведаў, які дазваляе адаптавацца да зменлівых умоў. Развіцце інтэлекту, яго сацыяльнай і практычнай накіраванасці, яго абстрактна-лагічных якасцей, рацыянальнасці і крытычнасці мыслення, авалоданне метадалогіяй пазнання ў прафесійнай сферы – такі далёка не поўны пералік развіваючага патэнцыялу спецыяльных дысцыплін агульнанавуковага цыкла.

Сярод спецыяльных дысцыплін – «Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы», галіновыя бібліяграфічныя курсы, «Абслугоўванне карыстальнікаў», «Фонды бібліятэк», «Бібліятэчна-інфармацыйны маркетынг», «Бібліятэчна-інфармацыйны менеджмент». Яны накіраваны на фарміраванне прафесійных уменняў і навыкаў па выкананні канкрэтных вытворчых функцый бібліятэкі. Хаця адпаведны прафесійны ўзровень пацвярджаецца і аднаўляецца на працягу ўсяго працоўнага жыцця, ужо на студэнцкай лаўцы закладваюцца асновы таго, што называецца «навучыцца рабіць», г.зн. пэўны ўзровень майстэрства ў вырашэнні прафесійных задач, творчасць у нестандартных сітуацыях, пошук нестандартных і эфектыўных рашэнняў.

Прафесіяналізацыю навучання ў ВНУ спецыялісты трактуюць па-рознаму. У навуковай літаратуры выдзяляюцца тры трактоўкі прафесійнай накіраванасці спецыяльных дысцыплін: 1) прафесійная накіраванасць забяспечваецца толькі зместам самой дысцыпліны; 2) вучэбны курс павінен забяспечыць будучага спецыяліста ведамі, уменнямі і навыкамі на ўсе выпадкі жыцця; 3) прафесійную накіраванасць трэба трактаваць як дыялектычнае адзінства зместу, форм і метадаў навучання, якія забяспечваюць будучых спецыялістаў не толькі неабходнымі ведамі, уменнямі і навыкамі, але і фарміруюць прафесійнае мысленне. (6, с. 23).

Менавіта апошні спосаб трактоўкі прафесійнай накіраванасці звязаны з узбраеннем студэнтаў метадалогіяй прафесійнай падрыхтоўкі, фарміраваннем не толькі тэхналагічных, метадычных, псіхолага-педагагічных асноў дзейнасці, але і здольнасцей да самаразвіцця, забеспячэнне неабходнага ўзроўню актыўнасці, здольнасці да пераносу і творчага выкарыстання атрыманых ведаў у бібліятэчнай практыцы.

Змест спецыяльных вучэбных дысцыплін вызначаецца сучасным станам развіцця спецыяльных навук, вопытам работы саміх бібліятэк, асаблівасцямі тэхналагічных працэсаў бібліятэчнай дзейнасці, выкарыстоўваемымі сродкамі і метадамі, накіраванасцю на атрыманне канкрэтных вынікаў работы ў выглядзе бібліятэчна-бібліяграфічных і інфармацыйных прадуктаў і паслуг. Акрамя прадметных ведаў, якія з'яўляюцца адначасова вынікам і сродкам пазнання ў галіне канкрэтнай навуковай і вучэбнай дысцыпліны, кожны спецыяльны курс уключае таксама і працэс дабывання ведаў, г.зн. гісторыка-метадалагічны раздзел. Гісторыка-метадалагічны аспект спецыяльных ведаў павінен быць раскрыты ў такой жа ступені, што і прадметны, каб забяспечыць цэласнае ўяўленне аб гісторыі і метадалогіі бібліятэчнай, бібліяграфічнай дзейнасці, дапамагчы ў цэласным фарміраванні ўяўленняў аб розных з'явах прафесійнай дзейнасці з сістэмных пазіцый, з'яўляцца асновай для далейшай самаадукацыі.

Нягледзячы на тое, што змест многіх спецыяльных бібліятэчна-бібліяграфічных дысцыплін носіць практычна арыентаваны характар, іх выкладанне будуецца не проста на прыстасаванні, узнаўленні вытворчых працэсаў, аперацый, але і носіць актыўна-развіваючы характар. У буйных бібліятэках у сувязі са спецыялізацыяй у дзейнасці супрацоўнікаў вельмі часта адбываецца абмежаванасць прафесіяналізацыі бібліятэчных кадраў выкананнем канкрэтных функцый, без сістэмнага засваенння ўсяго бібліятэчнага цыкла, без уяўлення яго месца ў агульнай вытворчай тэхналогіі; не заўжды бібліятэкі выкарыстоўваюць найбольш рацыянальныя метадычныя прыёмы работы і працуюць «па-прывычцы», у адпаведнасці з былымі традыцыямі і г.д. Менавіта спецыяльныя вучэбныя дысцыпліны даюць магчымасць сістэмнага, поўнага засваення ўсіх бібліятэчных цыклаў, абгрунтавання рацыянальнасці розных метадычных прыёмаў, параўнальную характарыстыку выкарыстоўваемых сродкаў працы, арыентаванасць на нарматыўна-рэгламентуючыя дакументы, знаёмяць з вопытам бібліятэк замежных краін шляхам параўнальнага аналізу, даюць магчымасць авалодаць методыкай і інструментарыем ацэнкі якасці і эфектыўнасці прафесійнай дзейнасці і г.д. У працэсе выкладання спецыяльных дысцыплін ёсць магчымасць пазнаёміць студэнтаў і з лепшымі ўзорамі бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці – крыніцамі бягучай дзяржаўнай бібліяграфіі, агульнай рэтраспектыўнай бібліяграфічнай інфармацыі, перспектыўнымі формамі бібліяграфічнага абслугоўвання карыстальнікаў, новымі мультымедыйнымі тэхналогіямі, якія сёння выкарыстоўваюцца яшчэ далёка не ва ўсіх бібліятэках нашай краіны і г.д.

Змястоўная трансфармацыя вучэбнага працэсу, арыентаваная на развіццё студэнта, прадугледжвае не толькі знаёмства, засваенне зместу пэўных вучэбных дысцыплін, але і актывізацыю яго самастойнай пазнавальнай дзейнасці. У працэсе выкладання гэтых дысцыплін ставіцца задача сфарміраваць не толькі прафесійныя ўменні і навыкі, але і такія якасці, як прафесійная адказнасць, шматварыятыўнасць мыслення, здольнасць да творчага вырашэння задач, уменне працаваць у калектыве, камунікатыўныя здольнасці і навыкі прафесійных зносін.

Актыўна-развіваючы характар выкладання спецыяльных дысцыплін знаходзіць сваё адлюстраванне як у змесце, так і ў выкарыстоўваемых формах навучання. Акрамя лекцый, семінарскіх, традыцыйных лабараторных і практычных заняткаў, усё больш выкарыстоўваюцца ў практыцы выкладання спецыяльных дысцыплін такія актыўныя формы, як ролевыя і дзелавыя гульні, трэнінгі, вырашэнне вытворчых сітуацый, дыялогава-дыскусійныя метады, навучанне ў парах, падрыхтоўка мерапрыемстваў для канкрэтнай мэтавай групы карыстальнікаў, метады «кэйсаў», індывідуальныя заданні і інш., якія накіраваны на стымуляванне як інтэлектуальнага, так і асабістага станаўлення студэнтаў. Гэтыя формы ў большасці сваёй будуюцца на выкарыстанні тэхналогій развіваючага навучання, накіраваных на фарміраванне рэфлексіўнага мыслення, тэхнікі праблематызацыі і дэпраблематызацыі. Гэтыя формы прадугледжваюць таксама развіццё эмацыянальнай сферы будучых спецыялістаў (задаволенасці ад выкананага задання, пачуццё прафесійнай годнасці, упэўненасці ў сабе і самапрынняцця, пазітыўных адносін да сваіх сакурснікаў, будучай прафесійнай дзейнасці, навакольнага свету, матывацыю



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

далейшай самаактуалізацыі і самаўдасканалення).

Павялічваецца колькасць гадзін на самастойную работу студэнтаў (на сённяшні дзень яна складае ад 20 да 40% ад агульнага курсу па асобных дысцыплінах), стымуляванне індывідуальнага пошуку імі інфармацыі і атрымання новых ведаў, г.зн. пераарыентацыя вучэбна-выхаваўчага працэсу на актывізацыю пазнавальнай дзейнасці студэнтаў.

Плануецца, а некаторыя нашы выкладчыкі ўжо пачалі выкарыстоўваць, змяненне сістэмы кантролю і ацэнкі ведаў і ўменняў студэнтаў, якая прадугледжвае распрацоўку і ўкараненне тэставых заданняў для прамежкавага і выніковага кантролю, рэйтынгавай сістэмы, дазваляючай ажыццяўляць пастаянны кантроль працэсу засваення зместу, а не толькі яго вынікаў, на заліках і экзаменах. Акрамя таго, гэтыя формы кантролю маюць і высокі выхаваўчы эфект, так як дазваляюць выкарыстоўваць метад спаборніцтва, вызначэння лепшых, укараняць і адпаведна ацэньваць выкананне заданняў рознай ступені складанасці, стымуляваць дапаўняльна творчую, навуковую дзейнасць студэнтаў, фарміраваць лідэраў бібліятэчнай справы са студэнцкай лаўкі.

Акрамя перадачы ведаў, авалодання ўменнямі і навыкамі прафесійнай дзейнасці, арыенцірам фарміравання прафесійных кампетэнцый з'яўляецца фарміраванне прафесійнага мыслення будучага бібліятэкара, прафесійнай накіраванасці асобы будучага спецыяліста, у структуры якога ўзаемадзейнічаюць інтарэсы і схільнасці да будучай прафесійнай дзейнасці як стартавая аснова для далейшага развіцця прафесійных здольнасцей, станоўчыя матывы выбару і атрымання прафесіі і намеры працаваць па спецыяльнасці.

Як паказалі вынікі сацыялагічных даследаванняў, для студэнтаў факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый характэрны вельмі нізкі ўзровень матывацыі выбару будучай прафесіі. Не спрыяе вызначэнню прафесійнай арыентаванасці на прафесію і адсутнасць прафесійнага адбору пры прыёме абітурыентаў на факультэт. Таму менавіта на выкладчыкаў спецыяльных дысцыплін ускладаюцца задачы не толькі навучання студэнтаў, але і фарміравання прафесійнай накіраванасці ў студэнтаў, накіраванасці на далейшае прафесійнае самаразвіццё.

Наяўнасць прафесійнай накіраванасці ў студэнтаў стварае ўмовы для самаразвіцця асобы будучага бібліятэкара, у структуры якога можна выдзеліць некалькі функцыянальных блокаў: самавызначэнне, самаарганізацыя, самапазнанне, самарэгуляцыя, самаадукацыя і самавыхаванне.

Прафесійнае самавызначэнне ўключае не толькі выбар будучай прафесійнай дзейнасці, але і самаідэнтыфікацыю сябе з ёй, разуменне ўласных задач у кожнай канкрэтнай сітуацыі, вызначэнне адэкватнай лініі паводзін, незалежнасць у вырашэнні праблемы, рэфлексію. З дапамогай прафесійнай самаарганізацыі асоба забяспечвае, плануе, арганізуе, кантралюе формы сваёй вучэбнай і вытворчай дзейнасці. Прафесійнае самавызначэнне ўключае рэфлексію, саманазіранне, уяўленне аб сабе як аб прафесіянале на аснове сумлення, самакрытыкі, разумення самаацэнкі і самадастатковасці. Фарміраванне прафесійнай самарэгуляцыі азначае прадастаўленне магчымасці студэнтам авалодаць спосабамі валодання сабой, унутранага самакантролю, умення аднаўляць уласныя сілы, здымаць стрэсы, карэкціраваць эмацыянальны стан. Самарэалізацыя ўключае самавыражэнне, самастойнасць, паслядоўнасць у дасягненні мэты і г.д.. Самарэалізацыя заключаецца ў накіраванні асобы на максімальнае раскрыццё творчых здольнасцей, на адэкватныя і гнуткія паводзіны, на раскрыццё патэнцыялу асобы. Прафесійная самаадукацыя і самавыхаванне заключаюцца ва ўдасканаленні прафесійнага мыслення, практычных уменняў і навыкаў, у тым ліку і саманавучання.

Натуральна, што прафесійнае развіццё асобы спецыяліста адбываецца на працягу ўсяго жыцця. Задача ж універсітэта – сфарміраваць здольнасць да самаразвіцця, усведамленне яго неабходнасці, высокі ўзровень прафесійнай накіраванасці. І ў гэтым плане выкладчыкамі спецыяльных дысцыплін шмат чаго робіцца: студэнты рыхтуюць пад час вучэбных заняткаў эсэ «Я і мая будучая прафесія», рэкламныя матэрыялы ў дапамогу прафарыентацыйнай дзейнасці бібліятэк, накіраваныя на бібліятэчную прафесію; праводзяць круглыя сталы, дні прафесійных зносін, дні спецыяліста на тэмы «Этыка бібліятэкара», «Імідж бібліятэкара», «Сацыяльны статус бібліятэкара», сустрэчы з прафесіяналамі бібліятэчнай сферы, выпускнікамі факультэта і г.д.

Між тым, нягледзячы на пэўныя спробы пераарыентацыі выкладання спецыяльных дысцыплін, супярэчлівасці застаюцца:

– яны, у большасці сваёй, носяць сугуба канкрэтны, вытворчы характар, арыентаваны на фарміраванне прафесійных уменяў і навыкаў будучых спецыялістаў, а не на фарміраванне ўсіх асноўных складаючых прафесійных кампетэнцый;

– нягледзячы на сучасную патрэбнасць у гнуткай сістэме навучання, якая прадугледжвае большыя магчымасці для студэнтаў у выбары альтэрнатыўных курсаў альбо тэарэтычных і прыкладных аспектаў дысцыплін, захоўваецца дырэктыўная мадэль арганізацыі заняткаў (прычым з кожным годам нават ужо склаўшаяся на факультэце добрая практыка прапановы для студэнтаў курсаў на выбар (а іх у асобныя гады прапаноўвалася звыш 20 назваў толькі па спецыяльных дысцыплінах) замяняецца дырэктыўным увядзеннем курсаў па рашэнню Міністэрства адукацыі РБ);

– фармальна студэнт прызнаецца суб'ектам адукацыйнай дзейнасці, і ў той жа час захоўваецца ў асноўным папярэдняя логіка навучання, разлічаная на пасіўнага аб'екта, калі выкладчык застаецца асноўнай крыніцай і інтэрпрэтатарам інфармацыі;

– супярэчлівасць паміж павелічэннем часу на самастойную работу студэнтаў і загружанасцю выкладчыка, нерацыянальнай, ненарміраванай (фармальнай і максімальна заніжанай) колькасцю гадзін, якія выдзяляюцца ў індывідуальным плане выкладчыка на кантроль за самастойнай работай студэнтаў – 2 гадзіны ў семестр на паток да 100 студэнтаў і ніводнай гадзіны на індывідуальную работу са студэнтамі;

– паміж неабходнасцю актывізацыі інфарматызацыі працэсу падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў і слабай матэрыяльна-тэхнічнай базай факультэта;

– паміж значнасцю для многіх студэнтаў дыплома як такавога і нежаданнем пэўнай часткі з іх развівацца ў асабістым і прафесійным плане;

– паміж фармальнай прэстыжнасцю ў грамадстве вышэйшай адукацыі і фактычнай прэстыжнасцю самой прафесіі «бібліятэкар-бібліёграф», што знаходзіць сваё адлюстраванне ў заробку, сацыяльных льготах, адносінах да бібліятэкараў з боку кіруючых органаў.

На вырашэнне адзначаных супярэчлівасцей і праблем павінен быць накіраваны ўвесь вучэбна-выхаваў-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

чы патэнцыял ВНУ, і для павышэння яго эфектыўнасці было б мэтазгодна выкананне наступных умоў:

– любой вучэбнай дзейнасці павінна папярэджваць асэнсаваная пастаноўка выкладчыкам пазнавальнай і выхаваўчай мэты вучэбнага курсу цалкам, асобнай лекцыі ці семінара, усіх іншых відаў і форм заняткаў;

– змена з вузкаролевага падыходу выкладчыка (як носьбіта і транслятара ведаў у пэўнай галіне) на сістэмна-ролевы падыход да выхавання студэнтаў, фарміравання прафесійнага мыслення, калі выкладчык асэнсоўвае і граматна выкарыстоўвае свой уплыў на асобу маладога чалавека;

– вывучэнне, выкарыстанне, арыентацыя на кодэкс прафесійнай этыкі пры падрыхтоўцы будучых бібліятэкараў, які дазволіць студэнтам асэнсаваць не толькі функцыянальную, але і маральную складаючую прафесійнай дзейнасці;

– вывучэнне і праектаванне з наступным выкарыстаннем у вучэбна-выхаваўчай дзейнасці ўзораў і схем сацыяльна-прафесійнай мабільнасці;

– развіццё традыцыйных і распрацоўка альтэрнатыўных форм навучання студэнтаў па кожнай вучэбнай дысцыпліне, пераход ад вербальнага навучання да альтэрнатыўнага, інавацыйнага – навучыцца самастойна авалодваць ведамі ўсё жыццё;

– пашырэнне сістэмы павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў, стымуляванне іх прафесійнага росту не толькі ў якасці спецыялістаў у сваёй прадметнай галіне, але і як кампетэнтных педагогаў, якія на высокім узроўні валодаюць псіхолага-педагагічнымі ведамі і навыкамі;

– выкарыстанне, у мэтах павышэння адказнасці студэнтаў за вынікі сваёй вучэбнай дзейнасці, практыкі паўторнага навучання непаспяваючых студэнтаў; арганізацыя дапаўняльных сесій на платнай аснове для слабапаспяваючых студэнтаў.

Пераход на кампетэнтнасную мадэль адукацыі патрабуе не толькі значнай актывізацыі пазнавальнай дзейнасці студэнтаў, але і актывізацыі вучэбна-выхаваўчага патэнцыялу выкладання спецыяльных дысцыплін пры падрыхтоўцы спецыялістаў бібліятэчнай сферы.

**Бібліяграфія**


1. Доклад третьего заседания ЮНЕСКО. – Париж, 1994.
2. Жук О.Л. Компетентносный подход в высшем профессиональном образовании // Адукацыя і выхаванне. – 2004. –№12. – С. 41–48.
3. Зимняя И.А. Ключевые компетенции – новая парадигма результата образования // Высшее образование. – 2003. –№5. – С. 34–42.
4. Макаров А.В. Компетентносная модель социально-гуманитарной подготовки выпускника вуза // Вышэйшая школа. – 2004. –№1. – С. 16–21.
5. Проблемы качества образования. Кн.2. – Москва–Уфа, 2003.
6. Сэндэр А.Н. Готовя профессионала – видеть личность // Вышэйшая школа. – 2001. –№1. – С. 21–25.



Summary

The article is devoted to the new paradigm in library education based on acquisition of experience in independent work and decision-making.


**Вольга Рамановіч**

## Бюлетэнь «Новыя кнігі»

Паважаныя сябры!

Хачу выказаць сваю думку і адносіны да бюлетэня «Новыя кнігі».

Працую з бюлетэнем больш 20-ці гадоў. Максімальна стараюся выкарыстоўваць яго ў сваёй рабоце і рэкамендую гэта сваім калегам-бібліятэкарам.

Падобнае выданне карыснае ўжо таму, што дае найбольш поўнае ўяўленне аб кнігавыданні на Беларусі.

Інфармацыйны бюлетэнь праглядаю штомесячна і выпісваю ў картатэку дакамплектавання патрэбныя для бібліятэкі кнігі, выкарыстоўваю пры састаўленні планаў работы, асабліва календары памятных дат. Лічу, што бюлетэнь можа быць як дапаможнікам для бібліятэкара, так і рэкламным выданнем для чытача. Чытач знаёміцца з ім у бібліятэцы і выбірае для сябе тыя кнігі, якія найбольш яго цікавяць.

Карыстаюцца папулярнасцю раздзелы:

- з гісторыі асобных рэгіёнаў, гарадоў і вёсак,
- настаўнікам і работнікам дашкольных устаноў,
- менеджэрам і прадпрымальнікам,
- эканамістам і юрыстам,
- у дапамогу абітурыенту.




У апошні час асаблівым попытам карыстаецца літаратура ў дапамогу сацыяльнаму работніку, таму было б добра, каб гэты раздзел быў выдзелены асобна.

За 2003–2004 гг. мы атрымалі цудоўныя выданні: «Беларуская энцыклапедыя», «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі» і іншыя даведнікі, якія ў нейкай меры кампенсуюць недастатковасць кніжнага фонду. Для бібліятэк, дзе слабы кніжны фонд і няма магчымасці набыць літаратуру, гэты бюлетэнь з'яўляецца дадатковай крыніцай для выканання запатрабаванняў чытачоў.

Пастаянна звяртаюся да дадаткаў:

- Шаг в бездну. – 2003. – №9
- Проблемы распространения религиозности на Беларуси. – 2002. – № 8.
- Запаветныя тэрыторыі Беларусі. – 2001. – №3, 4.
- Каляндар памятных дат і інш.

Бюлетэнь «Новыя кнігі» дае магчымасць пашырыць кругагляд па гістарычнай і культурнай спадчыне нашай краіны, тым больш, што назіраецца інтарэс да нас з боку іншых народаў і краін.

Асноўныя шляхі выкарыстання бюлетэня ў бібліятэцы:

- адказ на запыты чытачоў па розных тэмах,
- дакамплектаванне кніжнага фонду,
- рэкламны праспект для чытачоў,
- правядзенне мерапрыемстваў,
- афармленне кніжных выстаў,
- адзначэнне юбілеяў і памятных дат.



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ